**ПРЭЗЕНТАЦЫЯ**

# Беларус з-пад Вілейкі напісаў канстытуцыю для Украіны

*Упершыню на беларускай мове выйшла ў свет першая ўкраінская канстытуцыя, вядомая як «Канстытуцыя Піліпа Орліка».*




Унікальны выдавецкі праект быў ажыццёўлены Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі разам з Мінскім гарадскім таварыствам украінцаў «Заповіт» і Пасольствам Украіны ў Беларусі.

Пераклаў тэкст Канстытуцыі на беларускую мову **Ягор Сурскі**.

Як зазначыў намеснік дырэктара бібліятэкі **Алесь Суша**, «*гэты знакавы гістарычны дакумент быў створаны яшчэ ў 1710 годзе гетманам Піліпам Орлікам, якому ўсталяваны прыгожы помнік у Кіеве, яго іменем названы вуліцы. Але не ўсе ведаюць – і ва Украіне, і ў Беларусі, – што Орлік з'явіўся на свет у вёсцы Касута пад Вілейкай*».

Дарэчы, у Касуце ўсталяваны памятны знак Піліпу Орліку, там беларускія ўкраінцы ладзяць розныя ўшанавальныя мерапрыемствы.

**Антон ЗАГОРСКІ.**